# Выступленьне тав. ГІКАЛО

## НА НАРАДЗЕ САКРАТАРОЎ РАЙКОМАЎ І ПАМОЦНІКАЎ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ МТС ПА КАМСАМОЛЬСКАЙ РАБОЦЕ

Таварышы!

Толькі што выступаўшы да мяне прамоўца тут на нарадзе гаварыў пра тое, як мы добра справіліся з сяўбой і што тым лепш мы павінны справіцца з праполкай і ўборкай.

Гэта, таварышы, ня зусім так. Сяўба ў



нас праходзіла па Беларусі кепска, хоць правільна, што сяўбу мы па Беларусі ў гэтым годзе скончылі раней, чым у мінулым годзе, прычым у мінулым годзе мы недавыканалі плян па яравой сяўбе прыблізна, на 8—10 проц.

Але нельга параўноўваць цяперашні год з леташнім. Гэта значыць, не разумець таго, што мы маем ва ўсім Савецкім саюзе і, у прыватнасьці, у нас па БССР. У гэтым годзе мы маем, па-першае, значна лепшы палітычны настрой сярод сялянства і калгасьнікаў. Калі ў мінулым годзе мы мелі выхады калгасьніка з калгасаў, а ў асобных раёнаў гэтыя выхады насілі масавы характар, то ў гэтым годзе мы ня толькі ня мелі выхадаў, а наадварот, ёсьць вялікая цяга сярод аднаасобнікаў у калгасы. За гэту вясну ў калгасы па БССР улілося паводле далёка няпоўных даных больш за 50 тыс. новых гаспадарак. Па-другое, значна палепшыўся матар'яльны дабрабыт сялянства.

У мінулым годзе мы мелі надрэнны ўраджай, прычым сяляне Беларусі ад валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі здалі дзяржаве розных затоўках ня больш 6 проц. Харчовыя рэсурсы нашых калгасаў у асноўным больш чым здавальняючыя. Нашы калгасынікі забясьпечаны і хлебам і бульбай. А гэта ня гледзячы на кепскую работу па сяўбе мінулага году, калі каля 10 проц. папасеўнай плошчы было незасеянай. Якасьць апрацоўкі зямлі ў мінулым годзе таксама была не на вышыні. Колькі ў нас было агрэхаў, колькі было неахайнасьці пры правядзеньні пасеўнай кампаніі?!. Ня зусім добра ў нас праходзіла і ўборка. І тым ня менш нашы калгасы вышлі з харчамі добра. Нашы сяляне ў калгасах ужо жывуць лепш, чым раней. Гэта і прывяло да таго, што вясной гэтага году мы мелі вялікі прыліў у калгсы. Кожны працоўны селянін на практыцы пачынае пераконвацца ў перавазе калгаснага ладу.

Да недахопаў леташняй пасеўнай кампаніі трэба аднесьці і тое, што мы пачалі займацца сяўбой позна, па сутнасьці з 15—20 мая. Гэта спрыяла зацягненьню сяўбы.

І тут трэба проста сказаць, што з боку камуністаў і збоку камсамольцаў ня быў дан сапраўдны бальшавіцкі адпор гэтым адсталым настроям, якія дзейнічаюць на руку кулаку. Многія з нашых камсамольцаў ня мелі ў мінулым вялікага гаспадарчага вопыту і, уступаючы ў калгас, паверылі старым, паверылі ў старыя дзедаўскія традыцыі, замест таго, каб рашуча абвергнуць на справе гэту коснасьць, павярнуць вёску на новы шлях.

Гэта гаворыць таксама пра тое, што многія з членаў партыі і камсамольцаў ня маюць ніякага ўяўленьня аб агранаміі больш таго, ня хочуць авалодваць новай тэхнікай і ведамі ў галіне сельскай гаспадаркі. Гэта адна з прычын таго, што ня зусім хутка перамагаем старыя дзедаўскія традыцыі і коснасьць у справе разгортваньня масавай сяўбы.

У правядзеньні сяўбы ня былі улічаны і тыя ўрокі, якія мы мелі ў ходзе збожжазагатовак. Колькі было на мясцох напісана рэзалюцый аб барацьбе з гнілым лібэралізмам, аб барацьбе з славеснай дэкларацыйнасьцю, а ўсё-ж гэтая славесная дэкларацыйнасьць мела месца і пры правядзеньні сяўбы.

Вазьмеце, напрыклад, пытаньне з аўсом. Мы ў мінулым годзе вельмі шмат страцілі на аўсе. Гэта здарылася таму, што мы вельмі позна сеялі авёс, сеялі дзедаўскімі спосабамі пры кепскай апрацоўцы зямлі. Таму нам не хапіла кармоў для жывёлы.

Позна сеяць авёс гэта простае злачынства. Ён не пасьпее, а вось у нас ва многіх мясцох ёсьць такія партыйцы, якія думаюць, што з аўсом можна пачакаць, пазьней пасеяць. Напрыклад, Віцебск і іншыя раёны яшчэ дагэтуль ня выканалі пляну пасеву аўса. Гэта ёсьць вынік апартуністычнай недаацэнкі значэньня ранняй сяўбы, гэта ёсьць рэзультат самацёку ў рабоце. А што такое самацёк у перакладзе на палітычную мову. Гэта апартунізм сотпроцантны. А вось у нас ёсьць людзі, якія лічаць, што можна не арганізоўваць работу і шырокія калгасныя масы, палагаючыся на рэвалюцыю і лічачы, што загадам можна ўсё зрабіць.

Вазьмеце Віцебск. Партыйнае і савецкае кіраўніцтва Віцебску ўвесь час запэўнівала, што Віцебск вядучы раён: «у нас, бачыце, больш за 20 тыс. рабочых, буйныя прадпрыемствы «Сцяг індустрыялізацыі», «КІМ» і інш., вялікая партарганізацыя, плян сяўбы у нас нязначны—20 тыс. га, мы ўсіх шапкамі закідаем». І вось людзі замест таго, каб па-бальшавіцку ўзяцца за справу, ўлічыўшы вопыт загатовак, арганізаваць і расставіць людзей, накіраваць іх на барацьбу за бальшавіцкія тэмпы сяўбы, разьбіць апартуністаў і сабатажнікаў, якія разьлічваюць на самацёках у справе правядзеньня сяўбы—вядуць гутаркі: «Пасеяць для нас—гэта плёвая справа». Так могуць разважаць толькі работнікі, страціўшыя пэрспэктывы ў рабоце, неразумеючыя або не жадаючыя зразумець, як сёньня трэба працаваць.

У нас ёсьць цэлы рад фактаў, калі некаторыя раённыя арганізацыі, ячэйкі па-баявому не рэагуюць на апартуністычныя гутаркі і дзеяньні. Колькі было разважаньняў, прыкладам такога парадку: «Дождж ідзе, значыцца трэба пачакаць тыдзень, бо калі мы з загатоўкамі справіліся, значыцца і з сяўбой мы таксама лёгка справімся». Людзі не разумеюць, што такія разважаньні не спрыяюць арганізацыі мас, што гэта вядзе да дэзарганізацыі нашых радоў. Людзі не разумеюць таго, што сяўба ў нашых умовах праходзіць у абстаноўцы абвостранай клясавай барацьбы. Усякія разважаньні аб непагодзе, аб дождж ыку дзейнічаюць на руку

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы